**Люкшына, А.** На стале пахаронка / А. Люкшына // Прамень камунізму (Гарадок). — 1988. — 25 жніўн. — С. 2.

# НА СТАЛЕ ПАХАРОНКА

**Слаўныя сыны нашай шматнацыянальнай краіны, яны праявілі гераізм, аказваючы брацкую дапамогу афганскаму народу. Шмат з іх стала ахвярамі, абараняючы заваёвы афганскай рэвалюцыіі. Лічба загінуўшых у Афганістане ў Віцебскай вобласці перавышае 400 чалавек, а ў Гарадоцкім раёне дзве сям'і не дачакаліся сааіх сыноў.**

**Разам з першым сакратаром райкома камсамола С. Блажэем і кіраўніком раённага клуба воінаў-інтэрнацыяналістаў «Памяць» В. Адаменкам рэдакцыі давялося пабываць у вёсцы Зарніцы ў бацькоў Разумавых, сын якіх загінуў у Афганистане.**

У невялікай кватэры, першае, што кідаецца ў вочы – гэта прыкметы памяці: фатаграфіі. Яны ўсюды.

Перед тым, як пачаць цяжкую раэмову, доўга думалі, а ці трэба варушыць ледзь зацягнутую душэўную рану бацькоў. Адно слова ўспаміну, і яна пачне сачыцца крывёй. Самае страшнае ў жыцці бацькоў Разумавых, як яны самі лічаць, здарылася. Яны страцілі  сына Сяргея.

Лідзія Мікалаеўна і Аляксей Піліпавіч – простыя рабочыя людзі. З такой жа праматой яны гаварылі пра Сяргея. Маці і бацьке не прыдумвалі легенд і не імкнуліся перебольшыць заслугі сына-салдата. Гаварылі, як ёсць – праўду.

А праўда заключалася ў тым, што да арміі Сяргей быў звычайным хлопцам, якіх большасць. Адкрыты і добры чалавек. Адразу пасля заканчэння Гарадоцкага прафесійна-тэхнічнага вучылішча пайшоў у армію.

Лідзія Мікалаўна прыгадвае:

– Думалі, незаўважна праляцяць два гады службы. Мы як-небудзь, з намі ж дачка застаецца. А не сэрцы было чамусьці цяжка-цяжка... Думалася, як хутка вырас сын, ужо салдат.

Ездзілі бацькі да Сяргея, калі ён быў у вучэбцы. З імі ездзіла і сяброўка яго, Галя. Хлопец усё гаварыў маці: «Як прыйду з арміі, сыграем з Галяй вяселле».

Але не атрымалася так, як марылася.

Цяжка ўспамінаць Лідзіі Мікалаеўне той дзень, калі прыйшла пахаронка. Яна не можа без слёз. Смутак адбіўся на твары, аб гэтым крычыць яе параненае сэрца, Гэта адбылося ў сакавіку 1983 года. Толькі некалькі радкоў: «Ваш сын, Разумаў Сяргей Аляксеевіч, загінуў пры выкананні службовага абавязку». А колькі гора і слёз прынесла гэта маленькая паперка.

Магіла, кветкі, помнік. На помніку: Разумаў Сяргей Аляксеевіч, 19 гадоў. Помнік зроблен з граніту, на ім фотакартка хлопца з горда заломленым берэтам дэсантніка, а на грудзях аўтамат...

Прыветліва ласкае зямлю сонейка. Хочацца, каб яго шчодрыя промні сагрэлі сэрца маці Сяргея Разумава, каб падтрымалі яе рабяты з клуба «Памяць». І ў доме бацькоў загінуўшага салдата, нягледзячы ні на што, пасяліліся ўсмешкі. Не павінна гора застацца нераздзеленым.

Жыццё бярэ сваё. Вось ужо Лідзія Мікалаеўна і Аляксей Піліпавіч выдалі сваю дачку замуж. Няхай жа дом Разумавых напоўніцца дзіцячым гоманам, няхай дзеці будуць падобныя на свайго дзядзьку, Сяргея Разумава, які загінуў, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак.

**А. Люкшына**